Рэспубліка

# Узыходзіць зорка

**Студэнтка Дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў Ірына Кулагіна захапляецца эстрадным вакалам і народнай песняй. Яна ўдзельніца шматлікіх конкурсаў у нашай краіне і замежжы. Лаўрэацкія дыпломы прывезла з фестываляў у Сафіі і Таліне.**

Любімы музычны інструмент семнаццацігадовай Ірыны — гітара. Па класу класічнай гітары яна скончыла музычную школу ў родным Лепелі. Яшчэ ў дзяцінстве пачала пісаць песні.

Менавіта з уласным творам — песняй «Купальская» дзяўчына стала пераможцай у намінацыі «Аўтарская песня» на нядаўнім конкурсе маладых талентаў «Зорка ўзышла над Беларуссю».

Ірына марыць пра вялікую сцэну, любіць падарожнічаць па родным краі, старанна вывучае англійскую мову, а ў вольны час натхнёна вышывае крыжыкам і з цікавасцю асвойвае кулінарнае майстэрства нацыянальнай кухні.

***На здымку:*** *Ірына КУЛАГІНА.*

*Фота: Аляксандр ТАЛОЧКА*

Дата публикации: 14.08.2010

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ